# СА СВЯТАМ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА!

## ПРАГРАМА ПРАЦЯГЛАГА АРБІТАЛЬНАГА ПАЛЁТУ ПАСПЯХОВА ВЫКАНАНА

*Паведамленне ТАСС*

Савецкая навука і тэхніка дабіліся новага выдатнага дасягнення ў асваенні касмічнай прасторы. Паспяхова завершаны самы працяглы ў гісторыі касманаўтыкі пілатуемы палёт працягласцю 140 сутак.

2 лістапада 1978 года ў 14 гадзін 05 мінут маскоўскага часу пасля выканання запланаванай праграмы навукова-тэхнічных даследаванняў і эксперыментаў на борце арбітальнага комплексу «Салют-6» — «Саюз» касманаўты таварышы Кавалёнак Уладзімір Васільевіч і Іванчэнкаў Аляксандр Сяргеевіч вярнуліся на Зямлю. Спускаемы апарат касмічнага карабля «Саюз-31» зрабіў пасадку ў зададзеным раёне тэрыторыі Савецкага Саюза за 180 кіламетраў на паўднёвы ўсход ад горада Джэзказгана.

Праведзенае на месцы пасадкі папярэдняе медыцынскае абследаванне паказала, што касманаўты Кавалёнак і Іванчэнкаў добра перанеслі працяглы арбітальны палёт.

Стварэнне складанага навукова-даследчага комплексу, які ўключае арбітальную станцыю «Салют-6» з двума стыковачнымі вузламі, пілатуемыя касмічныя караблі «Саюз» і аўтаматычныя грузавыя караблі «Прагрэс», з'яўляецца выдатным інжынерна-тэхнічным дасягненнем савецкай касмічнай навукі і тэхнікі, якое адкрывае шырокія перспектывы ў далейшым асваенні космасу на карысць усяго чалавецтва.

Паспяховае ажыццяўленне вялікай касмічнай праграмы—выдатны падарунак Радзіме да 61-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

НЯХАЙ ЖЫВЕ 61-я ГАДАВІНА ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ!

(З Заклікаў ЦК КПСС).





ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 30 (309) | Субота, 4 лістапада 1978 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


## СЛАЎНЫМ КУРСАМ ПЕРАМОГ

**І. Ф. ЭСМАНТОВІЧ,**
**сакратар парткома, кандыдат гістарычных навук**

Штогод савецкія людзі адзначаюць нямала знамянальных дат і падзей. Сярод усіх свят нашай краіны асаблівае месца належыць дню нараджэння першай на планеце сацыялістычнай дзяржавы — святу Вялікага Кастрычніка. Яно стала дарагім і блізкім не толькі ўсім працоўным Краіны Саветаў, але і многім сотням мільёнаў нашых зарубежных сяброў.

Больш шасцідзесяці гадоў таму назад партыя бальшавікоў на чале з геніяльным правадыром У. І. Леніным, з'яднаўшы рабочых і сялян, звергнула ярмо капіталізму. Першая ў свеце пераможаносная сацыялістычная рэвалюцыя адкрыла новую гістарычную эпоху абнаўлення і сацыяльных перамен, эпоху да сацыялізму і камунізму.

По выказванню Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева «Кастрычнік — гэта сцяг вялікіх перамен, узнесены над дваццатым стагоддзем воляй і рукамі працоўных мас» (Ленінскім курсам, т. 6, М., 1978, с. 598).

За гады Савецкай улады наша краіна выйшла ў авангард сацыяльнага прагрэсу, пабудаваўшы грамадства развітога сацыялізму, што знайшло яркае адлюстраванне ў новай Канстытуцыі СССР

Надыходзячую 61-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка наша Радзіма сустракае на маршы завяршэння трэцяга года дзесятай пяцігодкі. Савецкія людзі настойліва ажыццяўляюць гістарычныя рашэнні XXV з'езда КПСС і наступных Пленумаў ЦК Камуністычнай партыі.

Савецкая дзяржава пачала сваю знешнюю палітыку з ленінскага Дэкрэта аб міры. Камуністычная партыя і Савецкі ўрад працягваюць настойлівую барацьбу за спыненне гонкі ўзбраенняў, за тое, каб ні адно пакаленне больш не зведала жахаў вайны, дамагаецца, каб усе дасягненні сучаснай навукі і тэхнікі былі падпарадкаваны далейшаму павышэнню дабрабыту людзей. Гэтай мэце павінны служыць і даследаванні касмічнай прасторы. Знамянальным з'яўляецца тое, што напярэдадні 61-ай гадавіны Вялікага Кастрычніка паспяхова завершаны небывалы па працягласці касмічны палёт экіпажа на чале з камандзірам навукова-даследчага комплекса «Салют-6»—«Саюз-31» нашым земляком Уладзімірам Кавалёнкам і бортінжынерам Аляксандрам Іванчэнкавым.

Сёлетняе свята Вялікага Кастрычніка для беларускага народа мае сваю адметнасць: падрыхтоўка да яго вялася з адначасовай барацьбой за дастойную сустрэчу слаўнага юбілею — 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. На ўдарнай вахце ўзоры працы паказалі работнікі сельскай гаспадаркі, якія сёлета вырасцілі самы багаты ўраджай зерневых культур і бульбы, паспяхова выконваюць заданні дзяржавы па продажу сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама калектывы прамысловых прадпрыемстваў. Усе мы з задавальненнем сустрэлі паведамленне ЦСУ БССР, што наша рэспубліка датэрмінова, 28 кастрычніка, завяршыла выкананне плана дзесяці месяцаў па рэалізацыі прадукцыі і вытворчасці большасці важнейшых відаў вырабаў.

За паспяховае ажыццяўленне сваіх высокіх сацыялістычных абавязацельстваў настойліва змагаецца і шматтысячны калектыў нашага універсітэта—вядучай вышэйшай навучальнай установы, навуковага і культурнага цэнтра беларускага Палесся. Сёлета многае зроблена для далейшага паляпшэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, у выніку чаго павысіўся ўзровень паспяховасці студэнтаў. Вучонымі ГДУ зроблены новы важкі ўклад у навуку, распрацоўку шэрагу навукова-даследчых праблем, маючых важнае народнагаспадарчае значэнне.

Больш сарака працэнтаў нашых студэнтаў вучацца на «добра» і «выдатна». У юбілейным годзе вучонымі ГДУ выдадзена 19 манаграфій і вучэбных дапаможнікаў. 9 выкладчыкаў паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Кафедрамі па гаспдагаворных тэмах выканана амаль на 700 тысяч рублёў навукова-даследчых работ.

Сёння мы па праву ганарымся працоўнымі здабыткамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта, якія сёлета асвоілі 2 мільёны 353,7 тысячы рублёў капіталаўкладанняў і заваявалі пераходны Чырвоны сцяг Гомельскага абкома камсамола. Нашы студэнты аказалі неацэнную дапамогу многім гаспадаркам вобласці на ўборцы вырашчанага ўраджаю сельскагаспадарчых культур, узнагародай за што стала шчырая ўдзячнасць працаўнікоў вёскі.

Ёсць усе падставы гаварыць, што 61-гадавіну Вялікага Кастрычніка, надыходзячы юбілей БССР і КПБ дружны і працалюбівы калектыў нашага універсітэта сустракае дастойна і прыкладзе ўсе намаганні для таго, каб дасягнутыя поспехі замацоўваць і памнажаць.

Ад імя парткома, рэктарата, грамадскіх арганізацый горача віншую вас, дарагія таварышы, з надыходзячым святам Кастрычніка! Новых вам здзяйсненняў і перамог у імя далейшага росквіту нашай любімай Айчыны!

## ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

27 кастрычніка ў актавай зале універсітэта адбылася VII справаздачна-выбарная студэнцкая прафсаюзная канферэнцыя.

Са справаздачным дакладам прафкома выступіла старшыня прафсаюзнага камітэта **Н. Колтышава.**

Даклад аб рабоце рэвізійнай камісіі зрабіла яе старшыня **А. Чарнецкая.**

У абмеркаванні справаздачных дакладаў прынялі ўдзел: **А. Емяльянава,** студэнтка біялагічнага факультэта, адказная за работу вучэбна-выхаваўчай камісіі факультэта; **І. Баркова,** прафорг групы 0-51 эканамічнага факультэта, якая заняла 1-е месца ва універсітэце і вобласці ў аглядзе-конкурсе на лепшую акадэмічную групу; **А. Ц. Барысюк,** старшыня спортклуба ГДУ; **В. Асіпенка,** студэнт эканамічнага факультэта, камандзір штаба працоўных спраў ГДУ; **М. Беразоўская,** намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ; **М. Казароз,** дырэктар клуба мастацкай самадзейнасці; **У. Зарэцкі,** студэнт эканамічнага факультэта, староста пад'езда інтэрната № 3; **М. Д. Рычкоў,** прарэктар па АГР.

Канферэнцыя прызнала работу прафкома за справаздачны перыяд здавальняючай. Выбраны новыя саставы прафсаюзнага камітэта і рэвізійнай камісіі.

Адбылося арганізацыйнае пасяджэнне прафсаюзнага камітэта, на якім выбраны старшыня прафкома, яго намеснікі і ўтворана 7 пастаянных камісій.

Справаздача з VII прафсаюзнай канферэнцыі будзе апублікавана ў адным з нумароў нашай газеты.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры педагогікі і псіхалогіі горача віншуюць выкладчыка гэтай кафедры КАДОЛА Фёдара Уладзіміравіча (навуковы кіраўнік — член - карэспандэнт АПН СССР, прафесар І. Ф. ХАРЛАМАЎ) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.**

* • *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат і студэнты гісторыка - філалагічнага факультэта, калектыў кафедры рускай літаратуры горача віншуюць выкладчыка гэтай кафедры ЗВОЗНІКАВА Аляксандра Андрэевіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

*Рэспубліканская навукова-тэарэтычная канферэнцыя*

# ПА ПРАБЛЕМАХ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ФІЛАСОФІІ







У мінулым месяцы на працягу двух дзён у нашым універсітэце праходзіла рэспубліканская навукова-тэарэтычная канферэнцыя па актуальных праблемах марксісцка-ленінскай філасофіі.

Канферэнцыя, якую ўступным словам адкрыў прарэктар па навуковай рабоце ГДУ прафесар **М. В. Навучыцель**, пачалася з пленарнага пасяджэння. Яе ўдзельнікі заслухалі даклады: прафесара **Ю. А. Харына** (МРТІ) — «Метадалагічныя аспекты распрацоўкі праблем сацыяльнай дыялектыкі», дацэнта **У. М. Калмыкова** (ГДУ) — «Сутнасць, асноўныя рысы і асаблівасці сацыялістычнага ладу жыцця», прафесара **А. Ф. Яцкевіча** (Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут) — «Класавы характар сацыялістычнага ладу жыцця», прафесара **Г. П. Давідзюка** (БДУ) — «Метадалагічныя асновы сацыяльнага кіравання», прафесара **М. І. Рубцова** (ГДУ) — «Суадносіны аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ў ператварэнні працы ў першую жыццёвую патрэбнасць», прафесара **А. С. Кляўчэні** (БДУ)— «Праблемы даследавання гісторыі марксісцка-ленінскай філасофіі і грамадскай думкі ў Савецкай Беларусі», прафесара **С. Г. Драбязко** (БДУ) — «Савецкая палітычная сістэма развітога сацыялізму», дацэнта **Я. А. Семенчука** (ГДУ)—«Узрастанне ролі КПСС ва ўмовах развітога сацыялізму».

Затым канферэнцыя працягвала работу па секцыях: «XXV з'езд КПСС аб дыялектыцы сацыяльных працэсаў як тэорыі і метадзе», «Сацыялістычны лад жыцця, шляхі і ўмовы далейшага яго развіцця і ўдасканальвання», «Метадалагічныя праблемы кіравання сацыяльнымі працэсамі ва ўмовах развітога сацыялізму», «Заканамернасці і фактары ператварэння працы ў першую жыццёвую патрэбу чалавека», «Праблемы тэорыі грамадства развітога сацыялізму», у якіх заслухана і абмеркавана звыш 80 дакладаў.

**У. СІДАРАЎ,**
**дацэнт кафедры філасофіі.**

**НА ЗДЫМКАХ: 1. З дакладам на пленарным пасяджэнні выступае загадчык кафедры філасофіі ГДУ дацэнт У. М. КАЛМЫКОЎ. 2. Удзельнікам канферэнцыі было аб чым пагаварыць у час перапынкаў.**

Фота **Б. Шкурко.**

*АНУ, ПЕРШАКУРСНІК!*

# ...І РАСКРЫЛІСЯ ТАЛЕНТЫ

Традыцыі, традыцыі... Нацыянальныя, літаратурныя, народныя, нарэшце, студэнцкія. Традыцыі вельмі жывучыя тады, калі ў іх шмат прыхільнікаў. Менавіта такой і з'яўляецца адна з іх — універсітэцкі агляд-конкурс «Ану, першакурснік!». Яна даўно заваявала вялікую папулярнасць студэнцкай моладзі.

Гэты юбілейны для камсамоліі краіны год—год 60-годдзя ВЛКСМ, 60-годдзя БССР і КПБ не стаў выключэннем. У канцы мінулага месяца сцэна актавай залы ГДУ гасцінна сустрэла юныя таленты, а добразычлівыя гледачы не скупіліся на апладысменты.

У конкурсе прымалі ўдзел першакурснікі ўсіх факультэтаў, акрамя факультэта фізвыхавання. У гэтым сенсе незразумелай з'яўляецца пазіцыя камсамольскага бюро названага факультэта, якое ўжо не ўпершыню «ігнаруе» такое важнае мерапрыемства, як агляд-конкурс самадзейных талентаў першакурснікаў.

Тэматыка праграм, з якімі выступалі студэнты-першакурснікі, прысвячалася 60-годдзю Ленінскага камсамола. Большасць факультэтаў падышла да падрыхтоўкі конкурсу з вялікай адказнасцю. Добра зразумелі пастаўленыя перад імі задачы студэнты гісторыка-філалагічнага, эканамічнага факультэтаў. Не вельмі прадуманымі ў кампазіцыйным плане аказаліся конкурсныя праграмы матэматычнага, біялагічнага і геалагічнага факультэтаў.

Пры падвядзенні вынікаў агляду-конкурсу журы ўлічвала адпаведнасць конкурснай праграмы зададзенай тэматыцы, кампазіцыю кожнага конкурснага канцэрта, узровень выканання нумароў.

Пераможцамі сярод факультэтаў выйшлі гісторыка-філалагічны і эканамічны факультэты. Другое месца падзялілі паміж сабой першакурснікі фізічнага і матэматычнага факультэтаў, на трэцім — аказаліся таленты біялагічнага і геалагічнага факультэтаў.

Самую разнастайную ў жанравых адносінах праграму прадставіў на конкурс гісторыка-філалагічны факультэт. Сольныя выступленні вакалістаў спалучаліся з харавымі спевамі, народныя танцы — з сучаснымі, са сцэны гучала класічная музыка. Выдатна дапаўнялі конкурсную праграму вядучыя Віктар Маючы і Людміла Колдава.

Высокім выканаўчым майстэрствам парадавалі членаў журы першакурснікі эканамічнага факультэта. У іх праграмным канцэрце не было нецікавых нумароў, прайшоў ён дынамічна, чотка. Арыгінальнасцю і ўласцівай студэнтам весялосцю вызначалася жартаўлівая інсцэніроўка вядомай песні «Усё могуць каралі», якая была вельмі цёпла прынята гледачамі.

Не ў поўнай меры выкарысталі свае магчымасці будучыя матэматыкі. Іх конкурсны канцэрт абмяжоўваўся зусім нязначнай колькасцю першакурснікаў, прычым адны і тыя ж студэнты выконвалі па некалькі нумароў.

Лепшымі салістамі агляду-конкурсу «Ану, першакурснік!» прызнаны **С. Шумейкін** з фізічнага факультэта, **М. Ганчароў** з біяфака, **А. Гайтман** (матэматычны факультэт), **М. Калягаеў** (геалагічны) і **Л. Твардоўская** (эканамічны).

Першымі сярод танцораў аказалася **А. Марозава** з біялагічнага факультэта, якая выдатна выканала «Кубінскі танец», і дуэт у саставе першакурснікаў фізічнага факультэта **В. Кузіна** і **С. Шут (на здымку).**

Журы адзначыла лепшых чытальнікаў агляду-конкурсу **А. Кніга, Л. Казанцаву, І. Врублеўскую** з гісторыка-філалагічнага факультэта, **А. Федасеенка** з матфака і **Р. Шпакава** з эканамічнага факультэта, які прачытаў напісаны ім верш «Трымае маё пакаленне на камуністаў раўненне».

Сярод музыкантаў-выканаўцаў лепшымі прызнаны **С. Румянцава** (гістфіл), **С. Дарашкоў** (геалагічны факультэт) і **Т. Карака** (матфак).

У ліку лепшых нумароў журы назвала таксама акрабатычны эцюд у выкананні групы дзяўчат з біялагічнага факультэта, арыгінальны жанр, з якім выступіла першакурсніца гістфіла **А. Федасеенка.**

Вынікі агляду-конкурсу падведзены. Але для першакурснікаў гэта толькі пачатак работы па развіццю сваіх творчых здольнасцей. Камітэт камсамола універсітэта, клуб мастацкай самадзейнасці запрашаюць удзельнікаў конкурсу «Ану, першакурснік!» і ўсіх жадаючых у калектывы мастацкай самадзейнасці ГДУ — драматычны, харавы, духавы, вакальна-інструментальны. Наперадзе ў вас—стварэнне новага, высокамастацкага рэпертуару, павышэнне выканаўчага майстэрства.

**В. КАПЫТКА,**
**старшыня прэс-цэнтра камітэта ЛКСМБ,**
**К. ПАХАЗІЛА,**
**студэнтка групы 0-21 эканамічнага факультэта.**



10-га ЛІСТАПАДА— ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ МІЛІЦЫІ

## Вартавыя правапарадку

Звыш 60 гадоў служыць народу савецкая міліцыя. Яна была створана па ініцыятыве У. І. Леніна пастановай Народнага камісарыята ўнутраных спраў 10 лістапада 1917 года «Аб рабочай міліцыі». Неацэнны ўклад у станаўленне міліцыі, умацаванне яе сувязей з органамі Усерасійскай надзвычайнай камісіі ўнёс палымяны бальшавік Ф. Э. Дзяржынскі. У арганізацыі першых атрадаў рэвалюцыйнага парадку, рабоча-сялянскай міліцыі ўдзельнічалі: М. І. Калінін, М. І. Фрунзе, К. Я. Варашылаў, Г. І. Пятроўскі, А. Джапарыдзе і многія іншыя дзеячы партыі і Савецкай дзяржавы.

Равесніца Вялікага Кастрычніка, у ваенных выпрабаваннях і ў буднях грандыёзных будоўляў міліцыя ішла ў нагу з усёй краінай. У гады грамадзянскай вайны работнікі міліцыі дапамагалі Чырвонай Арміі граміць белагвардзейцаў і інтэрвентаў; у суровы час Вялікай Айчыннай вайны яны мужна змагаліся ў радах дзеючай арміі і партызанскіх атрадах; на ўсіх этапах развіцця нашай краіны пільна стаялі на варце народнага дабра, грамадскага парадку, інтарэсаў савецкіх грамадзян.

Сёння генеральны напрамак дзейнасці міліцыі, праграму яе барацьбы за правапарадак ва ўмовах развітога сацыялістычнага грамадства вызначылі гістарычныя рашэнні XXV з'езда КПСС, патрабаванні новай Канстытуцыі СССР.

Камуністычная партыя пастаянна клапоціцца аб умацаванні аўтарытэта міліцыі ў народзе, аб тым, каб уся яе работа была прасякнута духам партыйнасці, законнасці і гуманнасці. Усямерна ўдасканальваецца работа міліцыі па прафілактыцы правапарушэнняў, выпраўленню і перавыхаванню праварушальнікаў, прававому выхаванню насельніцтва. Яе сіла і апора — падтрымка працоўных, цеснае ўзаемадзеянне з партыйнымі арганізацыямі і дзяржаўнымі органамі, прафсаюзамі, Ленінскім камсамолам, шырокай грамадскасцю.

Надзейныя памочнікі міліцыі — народныя дружыннікі. Каля 800 студэнтаў налічвае і добраахвотная народная дружына нашага універсітэта, якую ўзначальвае член парткома, загадчык кафедры спартыўных дысцыплін В. І. Сіськоў. Яна аказвае неацэнную дапамогу работнікам міліцыі ва ўмацаванні правапарадку ў нашым горадзе, у барацьбе з антыграмадскімі ўчынкамі. Дружыннікі універсітэта рэгулярна выходзяць на дзяжурствы, удзельнічаюць у аператыўных рэйдах, праводзяць вялікую работу пры дзіцячых пакоях міліцыі і домакіраўніцтвах. Адным з лепшых дружыннікаў універсітэта з'яўляюцца Анатоль Касабуцкі з матэматычнага, Міхаіл Сарасека з гісторыка-філалагічнага факультэтаў, будучыя эканамісты Уладзімір Чмых і Генадзь Кнышаў, Аляксандр і Васіль Дзядковы з біяфака і факультэта фізічнага выхавання, Іван Бісеў і Аляксандр Майсеенка з фізічнага і геалагічнага факультэтаў.

За ўзорнае нясенне службы па ахове грамадскага правапарадку ДНД універсітэта неаднаразова аб'яўлялася падзяка аддзелаў унутраных спраў г. Гомеля.

